# Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь

# Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка



**Прэзідэнт Беларусі з’яўляецца кіраўніком беларускай дзяржавы, гарантам Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, правоў і свабод чалавека і грамадзяніна. Яго паўнамоцтвы рэгламентуюцца Канстытуцыяй Беларусі і законам “Аб Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь”.**

# Дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь






## Сцяг

## Герб

**Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з двух гарызантальных каляровых палос: верхняй – чырвонага колеру і ніжняй – зялёнага колеру. Злева вертыкальна размешчаны беларускі арнамент чырвонага колеру на белым фоне.**
**Колеры нашага сцяга маюць наступныя значэнні:**
**Чырвоны – сіла, мужнасць, высакароднасць, энергія;**
**Зялёны – надзея, здароўе, маладосць, адраджэнне, працавітасць, стварэнне, прыродная гармонія;**
**Белы – чысціня, бязгрэшнасць, прымірэнне, мудрасць, веды.**

**Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой размешчаны ў сярэбраным полі залаты контур Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, накладзены на залатыя прамяні ўзыходзячага над зямным шарам сонца. Уверсе поля знаходзіцца пяціканцовая чырвоная зорка. Герб абрамлены вянком з залатых каласоў, пераплеценых справа кветкамі канюшыны, злева – кветкамі лёну. Вянок тройчы перавіты з кожнага боку чырвона-зялёнай стужкай, у сярэдняй частцы якой у аснове Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь у два радкі напісаны золатам словы "Рэспубліка Беларусь".**

# Дзяржаўны гімн
# Рэспублікі Беларусь

Музыка Н. Сакалоўскага,
Словы М. Клімковіч і У. Карызна

**Мы, беларусы – мірныя людзі,
Сэрцам адданыя роднай зямлі,
Шчыра сябруем, сілы гартуем
Мы ў працавітай, вольнай сям'і.**

**Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!**

**Разам з братамі мужна вякамі
Мы баранілі родны парог,
У бітвах за волю, бітвах за долю
Свой здабывалі сцяг перамог!**

**Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!**

**Дружба народаў – сіла народаў –
Наш запаветны, сонечны шлях.
Горда ж узвіся ў ясныя высі,
Сцяг пераможны – радасці сцяг!**

**Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма,
Вечна жыві і квітней, Беларусь!**

# Дзяржаўныя святы


















2023

ГОД МІРУ І
СТВАРЭННЯ